УДК 821.161.3–19:09

# СЯМЕЙНАЯ ХРОНІКА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XX СТАГОДДЗЯ

***Ярмоленка Алена Уладзіміраўна***
*кандидат филологических наук*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту*
*Гомель, Рэспубліка Беларусь*

# FAMILY CHRONICLE IN THE BELARUSIAN LITERATURE OF THE TWENTIETH CENTURY

***Yarmolenka Alena***
*PhD in Philology*
*Belarusian State University of Transport*
*Gomel, Republic of Belarus*

Полесгу

**Анатацыя:** Мастацкія творы класікаў беларускай літаратуры служаць прыкладам перадачы і захавання эстэтычных і маральна–этычных каштоўнасцей беларускага народа, аднаўлення сямейных сялянскіх абрадаў і звычаяў, якія ахопліваюць духоўную, нацыянальную і ўнутрысямейную сферу існавання чалавека. У артыкуле на матэрыяле аповесці М. Гарэцкага "Камароўская хроніка", трылогіі І. Мележа "Палеская хроніка" прааналізавана ідэйна–творчая і жанравая спецыфіка сямейнай хронікі.

**Abstract:** Creative works of classics of the Belarusian literature serve as an example of transfer and preservation of aesthetic, moral and ethical values of the Belarusian people, restoration of family country ceremonies and the customs covering the spiritual, national and intrafamily sphere of existence of the person. In the article on the story of M. Haretsky "Komarovskaya Chronicle" trilogy of I. Melezh "Poleskaya Chronicle" the ideological, creative and genre–specific family histories are analysed.

**Ключавыя словы:** сямейная хроніка, сага, духоўны свет, сямейныя традыцыі, сувязь пакаленняў.

**Keywords:** family chronicle, saga, spiritual world, family traditions, connection of generations.

Сямейная хроніка перажывае рэнесанс у постіндустрыяльным грамадстве. Збядненне духоўнага свету, страта сувязі з папярэднімі пакаленнямі з'яўляюцца асноўнымі праблемамі на пачатку XXI стагоддзя. Хроніка жыцця сям'і – своеасаблівая кропка апоры ў складаным і шматгранным навакольным свеце. Сямейныя абрады, рытуалы, легенды і паданні служаць асновай для падтрымкі традыцый: духоўных, нацыянальных, унутрысямейных. Яны ствараюць няўлоўную, нябачную, але адчувальную сувязь паміж пакаленнямі.

Жанр літаратуры, прадметам якога з'яўляецца адлюстраванне жыцця некалькіх пакаленняў адной сям'і, называецца сямейнай сагай або сямейнай хронікай. У сусветнай літаратуры сямейная хроніка выдзяляецца як жанр у выніку даследавання сямейнай тэмы пісьменнікамі–рэалістамі XIX стагоддзя. Аўтары сямейнай хронікі супастаўляюць лёс розных пакаленняў, выяўляюць іх падабенства і адрозненні, фіксуюць пераемнасць пакаленняў у кантэксце эпох. Гісторыя сям'і здольная ў сціслым выглядзе змясціць гісторыю краіны ў той ці іншы драматычны час.

Ствараючы сямейную хроніку, аўтар перш за ўсё цікавіцца вобразам прыватнага чалавека з яго індывідуальным лёсам, спалучаным з лёсам самых блізкіх яму людзей. Увага пісьменніка



Полесгу

скіравана на сацыяльна–бытавое, а не грамадскае жыццё асобы. Вытокі развіцця жанру сямейнай хронікі, у тым ліку і беларускай, знаходзяцца ў мемуарнай літаратуры, якая мае “інтымны” характар. У 18 стагоддзі велізарнае ўражанне зрабіў сямейны раман, які быў створаны А. Прэво пад уплывам розных жанраў, “Гісторыя кавалера дэ Грыё і Манон Леско” (1731). У далейшым, па меры ўваходжання прыватнага жыцця ў грамадскае, жанр сямейнага рамана набыў такія мадыфікацыі, што страціў выразныя межы.

У XX стагоддзі з’яўляюцца эпічныя раманы, якія літаратуразнаўцы адносяць да сямейнай хронікі. Напрыклад, М. Горкага “Жыццё Кліма Самгина” (1925–1936), Дж. Галсуорсі “Сага пра Фарсайтаў” і “Сучасная камедыя” (1906–1928), Г. Г. Маркеса “Сто лет адзіноты” (1967) і інш. Класічным прыкладам сямейнай хронікі ў сусветнай літаратуры служыць праца ўсяго жыцця Дж. Галсуорсі – “Сага пра Фарсайтаў” і “Сучасная камедыя”. Створаны ў перыяд з 1906 па 1927 гады, цыкл раманаў перадае драматычныя перажыванні галоўнага героя, якія супадаюць з заклапочанасцю самога Дж. Галсуорсі, выкліканай лёсам Англіі ў перыяд пасля Першай сусветнай вайны. Фарсайтаўскі цыкл ўключае шэсць раманаў. Першыя тры аб’яднаныя ў трылогію “Сага пра Форсайтаў”. Сюды ўваходзяць раманы “Уласнік” (1906), “У пятлі” (1920), “Здаецца ў наём” (1921), а таксама дзве інтэрлюдыі – “Апошняе лета Фарсайта” (1918) і “Абуджэнне” (1920). Другая трылогія – “Сучасная камедыя” – уключае раманы “Белая малпа” (1924), “Срэбная лыжка” (1926), “Лебядзіная песня” (1928) і дзве інтэрлюдыі “Ідылія” (1926) і “Сустрэчы” (1926).

Першапачаткова раман “Уласнік” быў задуманы як самастойны твор. Думка аб яго прадаўжэнні з’яўляецца ў пісьменніка ў 1918 года. Дж. Галсуорсі імкнецца адлюстраваць гісторыю Фарсайтаў у яе сувязі з лёсамі Англіі ў перыяд змены эпох. Асноўнай задачай пісьменніка з’яўляецца выяўленне асаблівасцей руху гісторыі. Для рэалізацыі гэтай задумы Дж. Галсуорсі піша ўжо не адзін раман, а цыкл раманаў, якія дазваляюць разгарнуць шырокую і шматгранную карціну жыцця сям’і Фарсайтаў на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. Аўтар стварае шырокае рэалістычнае палатно, праўдзіва адлюстроўвае грамадскае і прыватнае жыццё прадстаўнікоў англійскай буржуазіі, яе побыт, норавы, мараль. Апісаныя ім падзеі ахопліваюць перыяд з 1886 па 1926 гады. Цэнтральнай тэмай раманаў фарсайтаўскага цыклу выступае заняпад некалі магутнай і моцнай англійскай буржуазнай сям’і, крушэнне некалі трывалага ладу яе жыцця.

Класічным прыкладам сямейнай хронікі беларускай літаратуры XX–XXI стагоддзя з’яўляецца “Камароўская хроніка” (1986) М. Гарэцкага, “Палеская хроніка” (1960–1976) І. Мележа, цыкл

раманаў У. Гніламёдава "Сямейная хроніка ў духу барока": раманы "Валошкі на мяжы" (2004), "Уліс з Прускі" (2006), "Расія" (2007), "Вяртанне" (2008). Між тым, асаблівасці сямейнай хронікі беларускай літаратуры XX стагоддзя застаюцца маладаследаванымі, нягледзячы на багацце прадстаўленага матэрыялу.

Вывучэнню сямейнай хронікі прысвечаны шматлікія працы замежных даследчыкаў: Э. Абіньенце "Сямейныя ўспаміны. Гібрыдны жанр сучаснага рамана" [1], Е. В. Никольский "Преданья русского семейства»: жанр семейной хроники в русской литературе XIX–XX столетий" [2]. У беларускім літаратуразнаўстве шырокае асвятленне атрымала ў асноўным гісторыка–мемуарная проза: А. І. Мальдзіс "Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: нарысы быту і звычаяў" [3], Беларуская мемуарыстыка на эміграцыі [4], Г. Міхальчук "Літаратурная інтэрпрэтацыя родавай гісторыі Гаштольдаў у "«Хроніцы Быхаўца»" [5]. Такім чынам, актуальнай праблемай айчыннага літаратуразнаўства з'яўляецца даследаванне ідэйна–творчай і жанравай спецыфікі сямейнай хронікі.

Разбурэнне сялянскага ладу жыцця, трансфармацыя вёскі, пераасэнсаванне традыцыйных сямейных каштоўнасцей адлюстравана ў масштабных эпічных творах класікаў беларускай літаратуры М. Гарэцкага "Камароўская хроніка" і І. Мележа "Палеская хроніка" – раманы "Людзі на балоце" (1960), "Подых навальніцы" (1965), "Завеі, снежань" (1976). На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў пісьменнікі прасочваюць гісторыю сялянскай сям'і (сям'я Задумаў у "Камароўскай хроніцы", сям'я Дзятлаў, Глушакоў), праз прызму асабістага лёсу героеў разглядаюць гістарычныя падзеі пачатку XX стагоддзя: рэвалюцыю і калектывізацыю, Першую сусветную і Вялікую Айчынную вайну.

Асноўная думка, якая аб'ядноўвае творы М. Гарэцкага "Камароўская хроніка" і І. Мележа "Палеская хроніка", заключаецца ў захаванні ідэйна–эстэтычных і маральна–этычных каштоўнасцей беларускага народа, аднаўленні сямейных сялянскіх абрадаў і звычаяў, якія ахопліваюць духоўную, нацыянальную і ўнутрысямейную сферу існавання чалавека. Дэканструкцыя асноў сямейнага ўладкавання, антырэлігійная прапаганда, калектывізацыя і індустрыялізацыя, масавае перасяленне сялян у гарады – вядзе, па меркаванню пісьменнікаў, да маральнай дэзарыентацыі, страты фундаментальных сямейных каштоўнасцей.

Аповесць М. Гарэцкага "Камароўская хроніка" – гісторыя беларускага народа з 1863 па 1935–1936 – складаны і шматузроўневы твор, у якім адна вядучая тэма, напрыклад, сялянства, раскладаецца на шматлікія іншыя: доля жанчыны, лёс сялянскіх дзяцей, цяжкія ўмовы працы, прыгон, калектывізацыя і інш. Адной з галоўных тэм, якая

праходзіць праз усю творчасць М. Гарэцкага, з’яўляецца тэма сям’і, сямейнага паходжання беларускага інтэлігента. Сямейная хроніка М. Гарэцкага прысвечана характарыстыцы паходжання, станаўлення і развіцця роду Задумаў.

Перш за ўсё М. Гарэцкі паказвае, адкуль выйшлі гэтыя людзі. Першая частка аповесці расказвае пра гісторыю з’яўлення сям’і і першых яе прадстаўнікоў, якія “выбіліся ў людзі”. Гэта сыны вёскі, бацькі якіх потам і кроўю здабывалі сродкі на жыццё і адукацыю сваіх дзяцей. М. Гарэцкі піша, як паступова адукацыя прыходзіць у сям’ю Задумаў, як бацькі Ганны і Стахвана Задумаў і самі яны, пабачыўшы свет, усведамляюць неабходнасць навучання грамаце. Бацька Ганны большасць сваіх сродкаў траціць на навучанне сыноў, адмаўляючы ў неабходнасці асветы толькі Ганне, бо яна дзяўчынка. Але Ганна займаецца самаадукацыяй і больш за свайго мужа Стахвана разумее важнасць асветы для сваіх дзяцей. Менавіта Ганна вызначае лёс Лявона Задумы, уладкоўваючы яго ў школу. Яна шукае Лявону рэпетытара, які рыхтуе хлопца да экзаменаў.

Другая і трэцяя часткі аповесці апісваюць гарачае парыванне Лявона, Лаўрыка, Марынкі Задумаў да авалодання новымі ведамі, пазнання сябе і навакольнага свету. Убачыўшы гарадское жыццё, чытаючы кнігі і часопісы, займаючыся самаадукацыяй, яны пачынаюць крытыкаваць бытавыя і сацыяльныя ўмовы жыцця бацькоў. Але малады максімалізм паступова змяняецца разуменнем прычын і абставін гаротнага існавання вёскі. Адмаўленне пераходзіць у разуменне і асэнсаванне. У Лявона, Лаўрыка, Марынкі Задумаў з’яўляецца імкненне працаваць над адраджэннем вёскі: “Лаўрык вучыўся ў Нізінках, займаўся грамадскімі справамі, а потым паступіў яшчэ на службу ў гарсавет. Беларускі вучнёўскі гурток ставіў у Нізінках п’есы Галубка, выязджаў і ў мястэчкі ставіць іх. А друкаваных п’ес не было, трэба было іх дабываць у Менску і перапісваць. Вучні браліся за ўсё: за ўкладанне беларускай тэрміналогіі, за апрацоўку кніжачак па сельскай гаспадарцы для сялян на беларускай мове, за выданне свайго часопісу” [6, с. 132].

М. Гарэцкі добра разумее і імкнецца адлюстраваць трагічны лёс беларускай сям’і. Смерць Марынкі, высылка Лявона і Лаўрыка сведчаць пра пакуты і смерць многіх прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі. Пакуты бацькоў, пакуты сыноў апісаны на старонках “Камароўскай хронікі”, у шматлікіх дзённіках, лістах, і нататках сям’і Задумаў. Менавіта таму так актыўна М. Гарэцкі выкарыстоўвае дзённікі і лісты, каб засведчыць выпрабаванні эпохі: несправядлівасць і смерць на вайне, голад і нястачу ў час калектывізацыі, жорсткасць рэпрэсій. Перадача памяці нашчадкам – адна з асноўных мэтаў напісання “Камароўскай хронікі”. М. Гарэцкаму ўдалося стварыць



Полесгу

універсальны код, хроніку сям'і, якая адлюстроўвае лёс нацыі. Камароўка праз стагоддзі захоўвае ўспаміны, сведчыць аб неабходнасці ведаць сваё мінулае, каб мець надзею на будучае.

Гісторыя сялянскай сям'і, апісаная І. Мележам у раманах "Людзі на балоце", "Подых навальніцы", "Завеі, снежань", дзякуючы універсальным сацыяльна–бытавым праблемам, узнятым у трылогіі, і сёння гучыць па–сучаснаму. Ніхто так, як Мележ, дэталёва не паказвае палескую вёску сярэдзіны і канца 20–х гадоў XX стагоддзя цэльным, яшчэ не разарваным, эпічным асяроддзем жыцця з яго векавымі традыцыямі, запаветамі, абрадамі і вераваннямі. Значнасць "Палескай хронікі" вызначаецца перш за ўсё адкрыццём патрыярхальнага характару існавання селяніна, які рэгламентуе асабістае і грамадскае жыццё.

У раманах І. Мележа асноўнае месца займае апісанне традыцыйнай каляндарна–абрадавай арганізацыі сялянскага побыту, сялянскай працы сям'і Дзятлаў, Чарнушак, Глушакоў: "Яна перахрысціла яго, благаславіла і, уздыхнуўшы, пайшла к калёсам. Васіль, не нагінаючыся, каб не паказаць, быццам нешта здарылася, агледзеў касу і супакоіўся. Каса была цэлая. Ён зноў правёў па траве, каса ішла добра, як і раней" [7, с. 18–19].

Разбурэнне старога сялянскага свету, якое пачалося яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі, у часы калектывізацыі набывае катастрафічны характар. Калектывізацыя праводзіцца паспешліва, без элементарнай падрыхтоўкі, без уліку сялянскай псіхалогіі. Рэвалюцыя і калектывізацыя, на думку І. Мележа, парушаюць спрадвечны сямейны лад, разбураюць аснову народнай маралі, якая грунтуецца на хрысціянскіх запаведзях і язычніцкіх вераваннях: "І от зноў ішло. Як нейкая рэлігійная эстафета: ці даўно мінуўся той святы Мікалай, а ўжо блізка былі Каляды; з кожным днём набліжаліся, усё больш поўнілі Курані сваім клопатам. Чым бліжэй падступалі, тым больш брала Курані як бы ліхаманка. Як ні злаваў Міканор, а бачыў – ліхаманку гэтую не толькі не гналі, як хваробу паганую, а проста–такі рады былі ёй; к дурной папоўскай выдумцы – Калядам – не ішлі ціха сабе, з пакоры перад папом, царквою, а – спяшаліся, з ахвотай, з нейкай вясёлай нецярплівасцю! Як бы там і праўда – свята сапраўднае было! Нібы навыперадкі адзін перад адным, хапаліся дарабіць усё па гаспадарцы, – запасаліся на святы: везлі, складвалі ў хлявы сена, калолі дровы. Запасаліся не на дзень, на два – на ўсе Каляды, на два тыдні: у Каляды, па папоўскаму закону, нічога рабіць няможна, грэх!" [7, с. 170]. Такі гістарычны пералом, драматычны і трагічны час руйнавання асноў сямейнага жыцця дае магчымасць пісьменніку адлюстраваць заняпад традыцыйнай беларускай сялянскай сям'і, крушэнне некалі трывалага ладу яе жыцця.

І. Мележ апісвае невялікую, нічым асабліва не прыкметную вёску Курані, як цэлую дзяржаву. Асновай гэтай дзяржавы выступае сям'я, псіхалогію і сямейныя ўзаемаадносіны якой грунтоўна даследуе пісьменнік. Ён пераканальна паказвае складаны свет эмоцый і думак членаў сям'і Глушакоў, Дзятлаў, Чарнушак, адлюстроўвае духоўныя, нацыянальныя і унутрысямейныя традыцыі беларускай сям'і: "Перад царкоўнай агароджай коней спынілі, і маладыя і ўсё іх акружэнне пайшлі к царкве па ўтаптанай дарожцы пешкі. Калі Ганна ступіла за агароджу, трывогу яе раптам, як у вечар пасля змовін, пранізала пякучае джала шкадавання аб тым добрым, дарагім, якое яшчэ нядаўна не толькі не берагла, але і не заўважала. І якое заўважыла, пачула так позна. Перад тым, як страціць. Ступіўшы на ганак, яна мімаволі прыпынілася: так захацелася стаць, пачакаць, адцягнуць тое, што павінна было зараз адбыцца, павінна было палажыць мяжу між ёй і ўсім мінулым, неперажытым яшчэ, дарагім. Так хутка і – назаўсёды!" [7, с. 376].

На працягу стагоддзяў сям'я для беларускага народа з'яўляецца адзінай крыніцай захавання і перадачы маральна–эстэтычных каштоўнасцей. Сямейнае жыццё забяспечвае працяг роду, ахоўвае і стварае дабрабыт беларуса. Гуманістычная накіраванасць традыцыйнай народнай культуры знаходзіць сваё адлюстраванне ў лепшых творах класікаў беларускай літаратуры М. Гарэцкага і І. Мележа. У пачатку XX стагоддзя таленавітымі пісьменнікамі створана эпічная хроніка сялянскай сям'і (Задумаў, Чарнушак, Глушакоў), якая адпавядае лепшым здабыткам сусветнай мастацкай літаратуры.

## Спіс літаратуры

1. Abignente, E. Memorie di famiglia. Un genere ibrido del romanzo contemporaneo / E. Abignente // Enthymema – 2017. – № XX. – P. 6–17.

2. Никольский, Е. В. «Преданья русского семейства»: жанр семейной хроники в русской литературе XIX–XX столетий / Е. В. Никольский // Пушкинские чтения «Живые традиции в русской литературе : жанр, автор, герой, текст : Сб. науч. ст. – СПб., 2012. – С. 123–130.

3. Мальдзіс, А. І. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя : нарысы быту і звычаяў / А. І. Мальдзіс . – Мінск : Маст. літ., 1982 . – 255 с.

4. Беларуская мемуарыстыка на эміграцыі: [Зборнік / Уклад. Л. Юрэвіч. – Нью–Йорк : Бел. ін–т навукі і мастацтва, 1999. – 360 с.

5. Міхальчук, Г. Літаратурная інтэрпрэтацыя родавай гісторыі Гаштольдаў у "Хроніцы Быхаўца" / Г. Міхальчук // Роднае слова. – 2014. – №3. – С. 13–17.

ПолесГУ

6. Гарэцкі, М. Зб. Тв.: У 4 т. Т. 4: Камароўская хроніка : аповесць. Летапіс жыцця і творчасці / М. Гарэцкі. – Мінск: Маст. літ. – 1986. – 384 с.

7. Мележ, І. Зб. Тв.: У 10 т. Т. 5 : Людзі на балоце: Раман з “Палескай хронікі” / М. Гарэцкі. – Мінск: Маст. літ. – 1981. – 415 с.

ПолесГУ